

Фота Ярослава Ванюкевіча

# Мелодыя прасторы





Вераніка ЯХНО

**У аддзеле мастацтва Гродзенскай абласной навуковай бібліятэкі імя Я. Ф. Карскага пачала працу персанальная выстава «Свая прастора» прафесара кафедры дызайну ГрДзУ імя Янкі Купалы Аляксея Богустава. Яна будзе дзейнічаць да канца сакавіка.**

У экспазіцыі выставы не толькі карціны аўтара, але і вялікая колькасць яго ўзнагарод, дыпломаў, артыкулаў з часопісаў і газет, якія прысвечаны творчаму шляху мастака. На адкрыцці прысутнічалі яго родныя, калегі, прарэктар па выхаваўчай працы В. Сянько, дэкан факультэта мастацтваў і дызайну Л. Чарнілоўская, загадчык кафедры дызайну А. Ляшчынскі, а таксама студэнты і знаўцы творчасці Аляксея Богустава.

Рашэнне стаць мастаком у Аляксея Богустава з'явілася не адразу. Пачаткам сваёй мастацкай дзейнасці ён лічыць час службы ў арміі. «Служыў у Шчучыне, у авіяцыі, разам з мастакамі з Латвіі і Далёкага Усходу, са знакамітым расійскім акцёрам Аляксандрам Лазаравым. Часта гартаў кнігі па мастацтву. З цягам часу зразумеў, што гэта мне цікава», — расказвае мастак. Не дзіўна, што пасля таго, як дэмабілізаваўся, ён вырашае ісці далей менавіта па мастацкай сцежцы, вучыцца па мастацкім профілі. «Армейскія сябры параілі падацца ў Маскоўскі завочны народны ўніверсітэт мастацтваў імя Н. К. Крупскай» — успамінае Аляксей Паўлавіч. Я правучыўся там сем гадоў замест пяці, бо быў ужо дарослым чалавекам, працаваў участковым, мне не хапала часу выконваць і своечасова адсылаць працы».

Пасля была вучоба ў Латвійскай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў. Латышскую мову, культуру краіны мастак ведаў добра. І, як сам адзначае, яму часам здавалася, што і думае ён па-латышску. У Беларусі ён пачынае працаваць выкладчыкам, а затым і дырэктарам Дзіцячай школы мастацтваў у Мастах. Далей педагагічная дзейнасць працягваецца ў агульнаадукацыйнай школе. Пасля Аляксей Паўлавіч пачынае выкладаць у Гродзенскім каледжы мастацтваў, працуе выкладчыкам аддзялення мастацтваў ГрДзУ імя Янкі Купалы, дзе з'яўляецца прафесарам кафедры выяўленчага мастацтва. «Я выбраў Гродзеншчыну, таму што падчас сваёй службы вельмі палюбіў гэты край. Тут я сустрэў і сваё каханне. Вельмі задаволены тым, што апынуўся менавіта ў Гродне. Я лічу, што гэта горад-казка!» — з захапленнем адзначае мастак.

Аляксей Паўлавіч займаецца даследаваннем праблем методыкі выкладання мастацкіх дысцыплін. Выдадзены чатыры яго навучальныя дапаможнікі, два з якіх маюць грыф Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. Аляксей Богустаў — аўтар звыш пятнаццаці артыкулаў па тэматыцы выяўленчага мастацтва. Яго метадычная і вучэбная праца адзначалася шматлікімі ўзнагародамі, якія таксама можна ўбачыць на выставе ў аддзеле мастацтва. Апошняй з іх з'яўляецца дыплом лаўрэата міжнароднага конкурсу «Лепшая навуковая кніга ў гуманітарнай сферы-2014», якая была прадстаўлена ў Расіі. Паралельна з педагагічнай дзейнасцю працягваецца і творчая праца мастака. Ужо з 1990 года Аляксей Паўлавіч з'яўляецца сябрам Беларускага саюза мастакоў.

У мастацкіх выставах Аляксей Богустаў удзельнічае з 1979 года. Яны праходзілі не толькі ў Гродне, Мінску, але і ў Латвіі, Расіі, Польшчы. Мастаком праведзена больш за 20 персанальных выстаў, ён удзельнічаў у 8 міжнародных пленэрах жывапісу, стварыў больш за 150 жывапісных і графічных работ у розных жанрах.

Галоўным напрамкам творчасці мастака з'яўляецца жывапіс. Дарэчы, Аляксей Паўлавіч працуе ў розных тэхніках станковага жывапісу — алейнай, акварэльнай, тэмпернай і, як ужо адзначалася, розных жанрах — пейзажы, нацюрморце, тэматычнай карціне. Сярод асабістых работ найбольшую вагу для яго маюць пейзажы. «Лічу, што гэта адзін з самых плённых шляхоў у мастацтве. Пейзаж злучаны з зямлёй, са светабудовай, ён цесна звязаны з Богам, гэта прамы шлях да Яго», — падкрэслівае Аляксей Паўлавіч. — Я ствараю сваю філасофію жыцця. Таму і назваў выставу «Свая прастора».

Варта адзначыць, што маляўнічыя палотны гэтага цудоўнага мастака напоўнены каляровай лёгкасцю, свежасцю, непаўторнасцю, душэўнасцю, ад іх вее зямной прыгажосцю, «сваёй прасторай».

Мастацтвазнаўца Марына Чайко звяртае ўвагу на тое, што ў творчасці Аляксея Богустава гарманічна аб'ядноўваюцца каляровы задор юнака і сталы позірк мудраца.